# Нацыянальная бібліятэка атрымала першы падарунак па новым адрасе

**Ім стала калекцыя кніг расійскіх выдавецтваў — 5 тысяч экзэмпляраў і 298 найменняў — ад Пасольства Расійскай Федэрацыі ў Рэспубліцы Беларусь. Гэта цудоўна выдадзеныя даведнікі, энцыклапедыі, мастацкія альбомы, мастацкая літаратура. Цырымонія ўручэння калекцыі адбылася пазаўчора ў канферэнц-зале новага будынка Нацыянальнай бібліятэкі.**

— Цяпер многае адбываецца ўпершыню, — сказаў дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Раман Матульскі, — упершыню ў гэтай зале мы атрымліваем падарунак, і падарунак гэты ад самых блізкіх нашых сяброў — ад Пасольства Расійскай Федэрацыі.

У новым будынку Нацыянальная бібліятэка працуе тры тыдні, яна мае 19 чытальных залаў і 14 мільёнаў паліц, з якіх запоўнена толькі восем мільёнаў. Падарункі з'яўляюцца адной з крыніц папаўнення фондаў бібліятэкі і складаюць 22 працэнты ад усіх паступленняў. Менавіта Пасольства Расійскай Федэрацыі, а таксама расійскія выдавецтвы і кнігагандлёвыя арганізацыі зрабілі большую іх частку. Сёлета бібліятэцы ўжо было падорана 548 найменняў кніг са стэнда «Кнігі Расіі» на VIII кніжнай выставе-кірмашу «Кнігі Беларусі-2006». За мінулы год Расійскае пасольства розным арганізацыям, школам і бібліятэкам Беларусі перадала ў дар 300 тысяч экзэмпляраў кніг — гэта колькасць роўная фонду абласной бібліятэкі.

— Самае каштоўнае тое, што гэта вельмі запатрабаваныя кнігі, — заўважыў намеснік міністра культуры Рэспублікі Беларусь Валерый Гедройц.

Усе гэтыя кнігі з'яўляюцца ўзорам высакаякаснай паліграфіі. «Нам ёсць чаму вучыцца, — прызнаўся намеснік міністра інфармацыі Рэспублікі Беларусь Ігар Лапцёнак. — Расіяне задаюць нам высокую планку і дзякуй ім за гэта. Каб паспяваць за расійскімі паліграфістамі, канешне, трэба пераабсталяваць нашы выдавецтвы. Але я ўпэўнены, што хутка і мы будзем рабіць так». Намеснік міністра меў на ўвазе не толькі якасць кніг, але і іх колькасць.

Затое што датычыцца самой бібліятэкі, яе будынка, — тут беларусы перагналі і расіян, і іншыя краіны СНД. Пра гэта з захапленнем казаў Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Расійскай Федэрацыі ў Рэспубліцы Беларусь Аляксандр Сурыкаў.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**